Stepan Zakharkevich
Białoruski Uniwersytet Państwowy w Mińsku

# Роля ісламу ў культурнай адаптацыі татар на беларускіх землях у XVI-XVIII стст

На беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага, а потым і Рэчы Паспалітай пражывалі акрамя беларускай, літоўскай і украінскай этнічнай большасці этнічныя меншасці армянаў, палякаў, рускіх стараабрадцаў, татар, цыганоў, шатландцаў, яўрэяў і іншых[1]. Складанай з’яўлялася і рэлігійная структура. Негледзячы на дамінаванне хрысціянства, на тэрыторыі дзяржавы былі распаўсюджаны іслам, іудаізм (дарэчы не толькі артадаксальны, але і розныя секты – хасідызм, франкізм і інш.), язычніцкія ўяўленні цыганоў, караімізм. Хрысціянства таксама не было аднародным. Акрамя каталіцызму і праваслаў’я былі распаўсюджаны ўніяцтва берасцейскае (якое, дарэчы, колькасна дамінавала ў ВКЛ у XVIII ст.) і армянскае, розныя галіны пратэстантызму, праваслаўнае стараабраднiцтва розных напрамкаў. Гэтыя поліканфесійныя і шматэтнічныя ўмовы стваралі складаную сістэму сацыяльных адносінаў.

Для разумення складаных працэсаў культурнай адаптацыі этнічных меншасцяў Вялікага княства Літоўскага вельмі паказальнай групай з’яўляюцца татары. Яны больш за шэсцьсот гадоў пражываюць у хрысціянскім атачэнні на беларускіх землях, і негледзячы на невялікую колькасць, здолелі захаваць культурную спецыфіку.

---

[1] B. Rok, *Mniejszości narodowe i religijne w Rzeczypospolitej w czasach saskich. Stan badań i postulaty badawcze*, [w:] *Między barokiem a oświeceniem. Nowe spojrzenie na czasy saskie*, K. Stasiewicz, S. Achremczyk (red.), Olsztyn 1996, s. 74; H. Litwin, *Narody pierwszej Rzeczypospolitej*, [w:] *Tradycje polityczne dawnej Polski*, A. Sucheni-Grabowska, A. Dybkowska (red.), Warszawa 1996, s. 200-210.

Сучасная гістарыяграфія татараў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай з большага накіравана на вывучэнне сацыяльна-прававога стану татар ці на аналіз іх спецыфічнай рэлігійнай літаратуры – Каранаў, тэфсіраў, тэджвідаў і г. д. Фактычна не закранаецца пытанне аб тым, што паўплывала на здольнасць супрацьстаяць культурнай асіміляцыі невялікай "выспы" мусульманаў у хрысціянскім "акіяне". Бадай усе даследчыкі паўтараюць тэзіс аб ісламе як асноўным фактарам, што дапамог татарам зберагчы ўласную адметную культуру.

Артыкул мае спробай прааналізаваць ролю ісламу як рэлігійнага чынніка ў працэсах культурнай адаптацыі татараў беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XVI – XVIII стст.



У артыкуле пад культурнай адаптацыяй разумеецца працэс прыстасавання культурнага комплекса этнічнай групы да дамініруючай культурнай прасторы з дапамогай запазычання пэўных элементаў культуры ці ўсяго комплекса цалкам, процідзеяння дыфузіі комплексаў культуры праз будаванне сацыяльных бар'ераў, межаў ці маркераў. Для разумення ролі рэлігіі ў адаптацыйных працэсах у экалагічнай антрапалогіі выкарыстоўваюць тэрміны "рэсурсная прадказальнасць" – рэальная магчымасць доступу да сацыяльна-эканамічных, палітычных і культурных рэсурсаў пэўнага рэгіёну ці дзяржавы цалкам, і "адаптацыйны патэнцыял этнічнай групы" – сукупнасць знешніх умоў навакольнага культурнага асяроддзя і ўнутраных фактараў этнічных меншасцей, якія аказалі ўплыў на выбар той ці інакшай стратэгіі культурнай адаптацыі. Адаптацыйны патэнцыял татар трэба разглядаць як пэўны статычны стан культуры на момант перасялення на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага.

У гуманітарных і сацыяльных навуках заўсёды падкрэсліваецца кансалідуючая функцыя рэлігіі. Такім чынам, гэта дае падставы лічыць іслам татараў Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай важным элементам, вакол якога кансалідаваліся татары, стваралася групавая ідэнтычнасць і групавыя бар'еры для стабільнага захавання своеасаблівай культуры.

З аднаго боку іслам, як, дарэчы, і любая іншая рэлігія, выконваў функцыі сацыяльнай салідарнасці. Мусульманская традыцыя сталася падмуркам для аб'яднання моўна і культурна розных

татарскіх плямёнаў, якія сяліліся ў ВКЛ. Структуры самакіравання – джаміят – апіраліся на рэлігійную арганізацыю з цэнтрам пры мячэці і духоўным кіраўніком – імамам[2].

Вялікую ролю адыграў іслам у стварэнні ўласнай сістэмы адукацыі, праз якую адбывалася рэтрансляцыя культурных мадэляў татараў Вялікага княства Літоўскага. Для рэлігійных мэтаў неабходна было веданне арабскай мовы, на якой была напісана асноўная рэлігійная літаратура. Навучанне мове і знаёмства з ісламскай тэалогіяй адбывалася ў спецыяльных школах пры мячэцях у буйных абшчынах татараў[3]. Адна з першых згадак аб вывучэнні мусульманскіх рэлігійных традыцый знаходзіцца ў "Трактаце аб польскіх татарах" (Рысале-і-татары-і-Лех, 1558 г.): "…пры буйных мячэцях звычайна знаходзяцца імамы з Крыму ці Арды, у якіх навучаюцца нашыя дзеці…"[4]. Аўтар трактату шкадуе аб значнай адлегласці Крыма і немагчымасці дзяцей татараў Вялікага княства Літоўскага вучыцца ў мектэбе (пачатковай мусульманскай школе) і медрэсе (сярэдняй і вышэйшай мусульманскай вучэбнай установе) арабскай і асманскай мовам і іншым навукам, якія неабходныя для мусульманіна[5]. Выпадкі накіравання таленавітых вучняў на навучанне ў арабскія вучэбныя ўстановы былі даволі рэдкімі і патрабавалі значных фінансавых сродкаў. Адзін такі выпадак узгадваў папскі пасланнік у Рэчы Паспалітай, іезуіт Пассевіна[6].

У татарскіх школах Вялікага княства Літоўскага вылучалі тры узроўні падрыхтаванасці навучэнцаў: "biskicz" ці "kiskicz" – тых, хто мог чытаць Каран па слогах; "szahir (szehir)" – тых, хто ведаў Каран на памяць да 36 суры; "kurandzeja" – здольных прадэкламаваць на памяць Каран тры разы[7]. Значная рэлігійная літаратура была напі-





---

[2] A. Konopacki, *Życie religijne Tatarów na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI-XIX wieku*, Warszawa 2010, s. 83-85.

[3] S. Kryczyński, *Tatarzy litewscy. Próba monografii historyczno-etnograficznej*, RT, t. III, Warszawa 1938, s. 211.

[4] A. Muchliński, *Zdanie sprawy o Tatarach litewskich*, TWil., 1858, z. 4, s. 258.

[5] *Ibidem*, s. 260.

[6] S. Kryczyński, *Tatarzy…, op. cit.*, s. 328.

[7] *Ibidem*, s. 214.

сана арабскімі літарамі па-беларуску ці па-польску. Гэта сведчыла аб добрым узроўні адукацыі татараў Вялікага княства Літоўскага[8].

Навочным прыкладам рэлігійнасці татараў Вялікага княства Літоўскага былі татарскія тэстаменты. Найбольш яскрава гэта праяўляецца ў так званых легатах пабожных (запавету на мечэці і муллам) з прычыны захавання памяці аб сабе і імкнення да палёгкі душы. Эмінія Рубаява запісала на мячэць у Сорак Татарах сто сорак злотых, а сястрэ завяшчала: "…ма дасць злотых трыдцаць на куранаў пятнасце, валоў два, ктурэ шацуе па злотых пятнасце…тэ сумы і на куране легуе…"[9]. Князь Самуэль Абрагімовіч, харунжы татарскі Віленскі ў 1642 г. запісаў "…на Мечыт Мінскі злотых польскіх сто…"[10]. Ібрагім Кашэйдаравіч у сваім тэстаменту з 1677 г. завяшчаў жонке "…даць муллове за душу" капу грошей літоўскіх і шэсць злотых польскіх[11]. У 1684 г. Раман Давідовіч выдзеліў у легат дзялку зямлі Локушэвшчызна (поле, агарод і сад у Немежу каля Вільна) "на мечет немежанскі і вшісткі джеміят по часу вечным…"[12]. У 1687 г. жонка муллы, называная ў тэстаменту "молліна гудзянска" Мілося з Бараноўскіх Адзікевічова запісала: "…до мечыта Гудзянскего легуе огруд свій званы Кулімянковскім з паствіскем"[13]. Некаторыя легаты побожныя былі вельмі значнымі. У 1671 г. харунжы Давід Токаш запісаў на муллу мячэці на Лукішках 600 злотых польскіх, а харунжы татарскі Давід Мурза Бараноўскі перадаў значныя сумы на мячэці ў Сорак Татарах, Мерешлянах, Панарах, Сенкевічах і Гусейманах[14].



[8] Я. Станкевіч, *Беларускія мусульмане і беларуская літаратура арабскім пісьмом*, Вільна: б. в., 1928, с. 36.

[9] A. Zakrzewski, *Osadnictwo tatarskie w Wielkim Księstwie Litewskim – aspekty wyznaniowe*, „ABSlav., t. XX, 1989, s. 148.

[10] *Историко-юридические материалы, извлеченные из актовых книг губерний Витебской и Могилевской, хранящихся в Центральном архиве в Витебске*, Вып. 25, 1894, с. 406.

[11] A. Zakrzewski, *Osadnictwo…*, *op. cit.*, s. 148.

[12] A. Konopacki, *„Tak rozporadzam na chalę Boską...". Testamenty Tatarów Wielkiego Księstwa Litewskiego*, „Sokólskie spotkania z Tatarszczyzną", suplement do „Życia tatarskiego", 16/93, Sokółka 2008, s. 23.

[13] *Ibidem*.

[14] *Ibidem*.

З другога боку, іслам з'яўляўся важнай прычынай пераходу на культурныя мадэлі дамініруючых этнічных і сацыяльных груп ВКЛ. Па-першае, большасць прыкладаў пераходу татараў у хрысціянства звязаныя з XIV – XV стст., калі ў ВКЛ ствараліся першыя абшчыны татараў. Татары, якія асядалі на беларускіх землях Вялікага княства Літоўскага ў XIV–XV стст., пачалі міграваць у ВКЛ непасрэдна пасля прыняцця іслама, у часы панавання ў Ардзе хана Джанібека (1342–1357 гг.). Пагэтаму мусульманскія рэлігійныя традыцыі і інстытуты яшчэ моцна не ўкараніліся ў татарскім грамадстве і маглі быць лёгка замененыя на больш спрыяльныя для жыцця ў новым культурным асяродку ў Вялікім княстве Літоўскім. На думку польскіх гісторыкаў П. Бараўскага і В. Сянкевіча татары на Піншчыне і Давыдгарадокшчыне цалкам былі ахрышчаны ўжо к XV ст.[15] Гэта падцвярджаюць і этнаграфічныя дадзеныя. Яшчэ ў пачатку XX ст. у гэтым рэгіёне былі распаўсюджаныя ўсходнія элементы ў матэрыяльнай культуры, а давыд-гарадоцка-тураўскі строй традыцыйнага комплексу беларускага народнага адзення рэзка вылучаўся сярод іншых строяў ускладненымі сілуэтамі жаночага касцюма з арыгінальнымі галаўнымі ўборамі замужніх жанчын (галавачкамі) і масіўнымі нагруднымі ўпрыгожваннямі[16]. Таксама можна прывесці прыклады татарскіх родаў князёў Глінскіх і Сараевічаў, рода Волкавых, часткі рода Булгакаў, адна з галінаў рода Тарасоўскіх, як раз сведчаць аб тым, што іслам для татараў на беларускіх землях яшчэ не стаў атаясамляцца з культурнай, групавой ці этнічнай ідэнтычнасцю. На думку П. Бараўскага і В. Сянкевіча, ужо ў другой палове XVII ст. у падымных рэестрах паветаў можна знайсці дастаткова вялікую колькасць татараў, якія прынялі хрысціянства.

Дарэчы, аб факце нескончанасці працэсаў замацаванасці ісламу сярод татараў Вялікага княства сведчыць тое, што негледзячы на панаванне ў гітстарыяграфіі думкі аб суннізме татараў Вялікага княства Літоўскага, для іх былі характэрныя суфійскія элементы

[15] P. Borawski, W. Sienkiewicz, *Chrystianizacja Tatarów w Wielkim Księstwie Litewskim*, ORP, t. XXXIV, 1989, s. 98.

[16] *Этнаграфія Беларусі: Энцыкл*, Рэдкал.: І. П. Шамякін і інш., Мінск: БелСЭ, 1989, с. 164.

у рэлігійных традыцыях. Польскі гісторык А. Канапацкі сцвярджае наяўнасць суфізму на землях княства і прыводзіць прыклад кадзі з Даўбуцішак – Дэрвіша Чэлебі Хаджы Мурзіча. Даследчык лічыць, што Дэрвіш не імя, а тытул прыналежнасці да суфійскага ордэна. Другім доказам наяўнасці суфізму ў Вялікім княстве Літоўскім аўтар лічыць культ святога Эўліі Контуся, магіла якога знаходзіцца ў Лоўчыцах пад Навагрудкам. Эўлія ў перакладзе з арабскага – святы, а менавіта суфіі ў ісламе з'яўляюцца адзіным напрамкам, які прызнае культ святых[17].

Яшчэ адным прыкладам актыўных трансфамацыйных працэсаў, што праходзілі ў ісламскіх традыцыях татараў Вялікага княства Літоўскага было наяўнасць у рэлігійнай літаратуры татараў знахарскіх тэкстаў[18]. Гэта магло сведчыць ці пра захаванне даісламскіх язычніцкіх ўяўленнях татараў, ці аб уплыве беларускіх мясцовых традыцый знахарства. У тым ці іншым выпадку гэта сведчыць аб рэлігійным фактару хутчэй як сродку асіміляцыі, чым бар'ерам на яе шляху.



Па-другое, у канцы Сярэдневечча і Новага часу быць носьбітам ісламу ў хрысціянскай дзяржаве, дзе ішла безкампрамісная контр-рэфармацыйная барацьба, шлі моцныя тэалагічныя дыспуты паміж рознымі плынямі хрысціянства ці паміж імі і адэптамі іўдаізму і караімізму, было дастаткова небяспечна. Такім чынам, адаптацыйны патэнцыял татараў за кошт мусульманскага веравызнання ў хрысціянскай культурнай прасторы рэзка змяншаўся. Перш за ўсё былі зачыненыя ці вельмі ўскладненыя ўсе каналы для сацыяльнай мабільнасці, асабліва ў сферы палітыцы. Татары-мусульмане не мелі права ўдзельнічаць у працы сеймікаў і сеймаў, займаць дзяржаўныя пасады, нават у выпадку, калі валодалі тытулам князя і былі больш заможнымі, чым іх суседзі-шляхцічы. Таму, пераход часткі татарскай шляхты ў хрысціянства быў абумоўлены, безумоўна, імкненнем вырашэння праблемы палітычнай кар'еры. Неафітамі сярод татараў станавіліся тыя, хто быў найбольш моцна ўкаранёны ў сацыяльныя інстытуты ВКЛ, хто меў актыўныя кантакты з прадстаўнікамі палітычнай эліты і імкнуўся стаць яе часткай. Менавіта ў гэтым ракурсу

---

[17] A. Konopacki, *Życie…*, *op. cit.*, s. 89-91.

[18] І. Сынкова, М. Тарэлка, *Знахарскі тэкст з беларуска-татарскага рукапісу*, „Беларускі гістарычны агляд", t. 9, Сш. 1 (30), 2009, с. 139.

і трэбы разглядаць пераходы ў хрысціянства ў XVII – XVIII стст., найболь вядомы з якіх быў апісаны ў мемуары Яна Антонія Храптовіча: "… Першая нядзеля адвенту…У кафедральным касцёле ягомасць ксёндз біскуп віленскі [Аляксандр Сапега] ахрысціў татарына Кульбацкага, татарскага ротмістра, хростным быў – ягомасць пан вялікі гетман [Міхал Казімір Пац], хростнай – ягомасць пані падканцлерава Вялікага княства Літоўскага [Тэадора Нарушэвічава]. Потым усе былі на банкеце ў пана гетмана, які зрабіў хрэсьбіны таму зноў ахрышчанаму…"[19].

Важным чыннікам змены мусульманскага веравызнання на каталіцызм было таксама абмежаванне ў грамадзянскім праве. Мусульманам было забаронена браць шлюб з хрысціянкамі: у 1540 г. вялікім князем Жыгімонтам 1, у 1568 г. на Гродзенскім сойме. Потым гэтыя забароны неаднаразова паўтараліся[20]. Напрыклад, татарын Якуб Смольскі, радзівілаўскі земянін для шлюба з пані Глінскай перайшоў у каталіцызм[21]. З другога боку ў гістарыяграфіі добра вядомы словы аўтара "Альфарукана татарскага", які хаваўся пад псеўданімам Пятра Чыжеўскага аб тым, што татары бралі палігамны шлюб не толькі з простымі хрысціянкамі, а нават з шляхцянкамі[22]. Аднак да гэтага твору павінен быць асцярожным, бо цалкам відавочна непрыязныя адносіны Чыжэўскага да татараў і ісламу[23].

Аднак абвяшчэнне абмежавання правоў татараў у Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай яшчэ не азначалі рэальнае іх выкананне. Так, напрыклад, Статуты Вялікага княства Літоўскага 1566 і 1588 гг., а таксама сеймавая пастанова 1616 г. забаранялі татарам мець чэлядзь і слуг хрысціянскіх. Аднак тэстаментам князя Самуэля Абрагімовіча ад 1642 г. завешчана "…служэбніцы маей Агапі Стэфанаўне, за верне





---

[19] J. A. Chrapowicki, *Diariusz*, cz. II, A. Rachuba, T. Wasilewski (wyd.), Warszawa 1988, s. 369.

[20] A. Zakrzewski, *Islam między Wschodem a Zachodem: Tatarzy w Wielkim Księstwie Litewskim XVI-XVIII w.*, [w:] *Między Zachodem a Wschodem. Etniczne, kulturowe i religijne pogranicza Rzeczypospolitej w XVI-XVIII wieku*, K. Mikulski, A. Zielińska-Nowicka (red.), Toruń 2005, s. 204.

[21] P. Borawski, W. Sienkiewicz, *Chrystianizacja…, op. cit.*, s. 112.

[22] P. Czyżewski, *Alfurkan tatarski prawdziwy* [...], Wilno 1617, s. 40.

[23] K. Grygajtis, *Alfurkan tatarski siedemnastowieczny paskwil na Tatarów litewskich*, „Ze skarbca kultury", t. XLVIII, 1989, s. 26.

і жычліве послугі ей, ктурыхем я од ней з млодосці лят ей аж до тего часу дознавал, ма се достаць…”[24]. Цікава яшчэ тое, што тэстамент быў актыкаваны ў гродскія кнігі ў Віцебску, дзя ўпаміны ў тэстаменту татарына хрысціянскай прыслужніцы не вызвала пытанняў. Яшчэ адзін доказ таго, што прававыя патрабаванн да татар ВКЛ моцна адрозніваліся ад паўсядзённай практыкі.

Такім чынам можна зазначыць, што іслам адначасова меў дваісты уплыў на працэсы культурнай адаптацыі татараў беларускіх зямель Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Па-першае, мусульманскія традыцыі ўплывалі на адаптацыйны патэнцыял татараў, гэта значыць на сукупнасць знешніх умоваў навакольнага асяроддзя (дамінуючага культурнай і этнічнай прасторы). Вызнанне ісламу ў хрысціянскай краіне, дзе сацыяльная мабільнасць была пэўным чынам абмежавана нават праваслаўным і пратэстантам, не стварала добрага падмурку для стабільнага падтрымання культурнай своеасаблівасці. Аб гэтым сведчаць прыклады пераходу татараў у хрысціянства. Прычым не толькі ў каталіцызм, а і ў праваслаў’е, як гэта было з родам князёў Сараевічаў.



Аднак адносіны да татараў былі больш талерантнымі, чым да некаталіцкіх накірункаў хрысціянства. У 1595 г. пад час дыспуту паміж праваслаўным і каталіцкім духавенствам аб уніі было адзначана, што “… права татараў і няверных яўрэяў, якія мала ведаюць Бога, а таксама армянаў і іншых у дзяржаве яго каралеўскай міласці, нашага пана не парушаюцца і абараняюцца, тым мацней павінны абараняцца права праваслаўных…”[25]. Хрысціяне-пратэстанты нярэдка скардзіліся, што іудзеі і мусульмане знаходзяцца ў значна лепшым становішчы ў ВКЛ, чым хрысціяне-некатолікі[26].

З другога боку іслам стаў найважнейшым культурным маркерам, які дапамог татарскай абшчыне захаваць своеасаблівасць уласнай культуры.

---

[24] *Историко-юридические*, *op. cit.*, *с. 406*..

[25] A. Konopacki, *Życie…*, *op. cit.*, s. 108..

[26] A. Zakrzewski, *O asymilacji Tatarów w Rzeczypospolitej w XVI-XVIII w.*, [w:] *Tryumfy i porażki. Studia z dziejów kultury polskiej XVI-XVIII w.*, M. Bogucka (red.), Warszawa 1989, s. 88.